ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

**Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

# Аналітычная справаздача па выніках назірання за вылучэннем і рэгістрацыяй кандыдатаў у Прэзідэнты

*Назіранне за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца РПГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт" і ПЦ "Вясна" ў рамках кампаніі"Праваабаронцы за свабодныя выбары"*

## Высновы

– вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты адбывалася ў атмасферы пагроз, нагнятання страху і ціску на грамадзян у сувязі з іх актыўнасцю у выбарах. Ад пачатку выбарчай кампаніі да заканчэння этапа вылучэння і рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты ў краіне зафіксавана больш за 700 затрыманняў сяброў ініцыятыўных груп, актывістаў, палітыкаў, блогераў, журналістаў, удзельнікаў "ланцугоў салідарнасці", 129 чалавек былі пакараныя адміністрацыйнымі арыштамі, 252 чалавекі аштрафаваныя, 25 узятыя пад варту па крымінальных артыкулах і ў выніку прызнаныя палітычнымі вязнямі;

– заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты падалі 55 чалавек, што стала рэкордам за ўсю гісторыю прэзідэнцкіх выбараў у краіне;

– зарэгістраваныя 15 ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты – Аляксандра Лукашэнкі, Алега Гайдукевіча, Юрыя Ганцэвіча, Уладзіміра Няпомняшчых, Наталлі Кісель, Віктара Бабарыкі, Валерыя Цапкалы, Сяргея Чэрачня, Вольгі Кавальковай, Ганны Канапацкай, Андрэя Дзмітрыева, Святланы Ціханоўскай, Аляксандра Таболіча, Юрыя Губарэвіча і Мікалая Казлова, што складае 27% ад агульнай колькасці разгледжаных заяў аб рэгістрацыі;

– адмовы ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп на падставе парушэння добраахвотнасці ўдзелу ў выбарах сведчаць аб маніпуляцыях ЦВК палажэннямі ВК і парушаюць прынцып роўнасці кандыдатаў. Вынікі разгляду скаргаў на адмовы ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп Вярхоўным Судом

паказваюць неэфектыўнасць гэтага сродку прававой абароны ўдзельнікаў выбарчай кампаніі;

– вызначэнне месцаў, дзе забаронена пікетаванне па зборы подпісаў выбаршчыкаў за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты, не стварыла сур’ёзных перашкодаў для збору подпісаў ініцыятыўнымі групамі. Адзначаецца адсутнасць адзінага падыходу мясцовых органаў улады да вызначэння такіх месцаў;

– дазвол збіраць подпісы на тэрыторыях прадпрыемстваў і ўстаноў стварыў дадатковыя ўмовы для супрацьпраўнага выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу ў падтрымку дзеючага кіраўніка краіны, што і было пацверджана шматлікімі фактамі, зафіксаванымі назіральнікамі кампаніі;

– збор подпісаў прайшоў с сур’ёзнымі парушэннямі стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, ініцыятыўныя групы асобных прэтэндэнтаў падвергліся значнаму ціску з боку праваахоўных органаў;

– выбарчыя камісіі падцвердзілі збор неабходных 100 тысяч подпісаў шасцю прэтэндэнтамі. Праверка подпісаў, як і раней, адбывалася непразрыста, дадатковай падставай для недаверу да яе вынікаў і прадметам шырокага абмеркавання грамадскасці паслужыў той факт, што ў двух патэнцыйных кандыдатаў ЦВК прызнала амаль у паўтара разы большую колькасць подпісаў, чым яны папярэдне заяўлялі;

– з сямі асоб, якія вылучаліся кандыдатамі ў Прэзідэнты і прадставілі подпісы, сабраныя за іх вылучэнне, кандыдатамі зарэгістраваныя пяць;

– рэгістрацыя кандыдатаў адбылася з парушэннем стандартаў сумленных і справядлівых выбараў. Віктару Бабарыку было адмоўлена ў рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты на падставе звестак Камітэта дзяржаўнага кантролю аб ходзе расследвання крымінальнай справы, што парушае прынцып прэзумпцыі невінаватасці. Рашэнне ЦВК аб адмове Віктару Бабарыку ў рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь парушае яго права быць абраным;

– 14 ліпеня ў розных гарадах Беларусі людзі выйшлі на вуліцы, каб выказаць пратэст супраць адмовы ў рэгістрацыі кандыдатамі на пост прэзідэнта альтэрнатыўных вылучэнцаў – Віктара Бабарыкі і Валерыя Цапкалы. Было затрымана каля 250 чалавек, з іх каля 200 – у Мінску. Сярод затрыманых – журналісты, якія ажыццяўлялі прафесійную дзейнасць па асвятленні акцый. 15 ліпеня ў сувязі з падзеямі ў Мінску была распачата крымінальная справа па арт. 342 Крымінальнага кодэкса.

## Прававая база

У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь асоба, якая мае права абірацца на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь[1], не пазней чым за 85 дзён да выбараў падае ў Цэнтральную камісію па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў[2] пісьмовую заяву аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, копіі старонак пашпарта, якія пацвярджаюць грамадзянства і рэгістрацыю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, спіс сябраў ініцыятыўнай групы з указаннем кіраўніка ініцыятыўнай групы і каардынатараў па рэгіёнах. Названыя дакументы могуць быць пададзеныя як асабіста грамадзянінам, які мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты, так і яго прадстаўніком на падставе засведчанай даверанасці. ЦВК разглядае заяву ў пяцідзённы тэрмін з дня яе паступлення, рэгіструе ініцыятыўную групу і выдае сябрам ініцыятыўнай групы пасведчанні і падпісныя лісты для збору подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

У рэгістрацыі ініцыятыўнай групы адмаўляецца, калі асоба, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты, не адпавядае крытэрыям у выпадку парушэння патрабаванняў ВК. Адмова ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы можа быць абскарджана ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння аб адмове ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін.

Асоба, якая вылучаная кандыдатам у Прэзідэнты, прадстаўляе ў Цэнтральную камісію да пачатку рэгістрацыі шэраг дакументаў.[3] Цэнтральная камісія правярае адпаведнасць парадку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты патрабаванням ВК і дакладнасць звестак у прадстаўленых для рэгістрацыі дакументах.

Рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь прымаецца пры наяўнасці адпаведных дакументаў і пратаколаў абласных, Мінскай гарадской камісій, якія пацвярджаюць наяўнасць не менш за 100 тысяч подпісаў

---

[1] Згодна з ч. 1 арт. 57 ВК Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь па нараджэнню, не маладзейшы за 35 гадоў, які валодае выбарчым правам і пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь не менш за дзесяць гадоў непасрэдна перад выбарамі. А згодна з ч. 7 арт. 60 ВК кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты не могуць быць вылучаны грамадзяне, якія не маюць права ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь займаць пасады ў дзяржаўных органах і іншых дзяржаўных арганізацыях у сувязі з наяўнасцю судзімасці.

[2] Далей у тэксце – ЦВК і Цэнтральная камісія.

[3] Гэта пісьмовая заява аб згодзе балатавацца кандыдатам у Прэзідэнты; біяграфічныя дадзеныя асобы, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты, у тым ліку звесткі аб судзімасці; копіі дакументаў, якія пацвярджаюць звесткі пра адукацыю, пра месца працы, пасады (занятку) асобы, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты; дэкларацыя аб даходах і маёмасці асобы, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, яго жонкі (мужа) і паўналетніх блізкіх сваякоў, сумесна з ім якія пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, па форме, зацверджанай Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Асоба, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты і стварыла выбарчы фонд, прадстаўляе ў Цэнтральную камісію фінансавую справаздачу аб расходаванні сродкаў гэтага фонду.

выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты. Цэнтральная камісія, устанавіўшы адпаведнасць парадку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты патрабаванням ВК, прымае рашэнне аб рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты і ў двухдзённы тэрмін пасля рэгістрацыі выдае кандыдатам адпаведныя пасведчанні.

У адпаведнасці з арт. 68-1 ВК Цэнтральная камісія адмаўляе ў рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты ў выпадку: неадпаведнасці асобы, якая вылучана кандыдатам, патрабаванням, што прад'яўляюцца ВК; наяўнасці судзімасці ў асобы, якая вылучана кандыдатам; невыканання патрабаванняў, прадугледжаных ВК да вылучэння кандыдата; непрадстаўлення аднаго або некалькіх дакументаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдата; недастатковага для рэгістрацыі кандыдата колькасці дакладных подпісаў выбаршчыкаў, сабраных у падтрымку вылучэння кандыдатам; выкарыстання ў інтарэсах абрання грашовых сродкаў або іншай матэрыяльнай дапамогі замежных дзяржаў і арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, міжнародных арганізацый, арганізацый, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства; наяўнасці ў падпісных лістах па вылучэнню кандыдата ў Прэзідэнты у цэлым па Рэспубліцы Беларусь больш за 15 працэнтаў несапраўдных подпісаў ад агульнай колькасці правераных подпісаў выбаршчыкаў; у іншых выпадках неадпаведнасці парадку вылучэння патрабаванням ВК.

Цэнтральная камісія *мае права* адмовіць у рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты ў выпадку: прадстаўлення ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці асобы, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь не адпаведных рэчаіснасці звестак, якія маюць істотны характар; выкарыстання пераваг службовага становішча ў інтарэсах абрання; удзел адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў выбаршчыкаў, прымусу ў працэсе збору подпісаў і ўзнагарода выбаршчыкаў за ўнясенне подпісу; паўторнага парушэння асобай, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты або ініцыятыўнай групай патрабаванняў ВК і іншых актаў заканадаўства аб выбарах, калі раней ім было вынесена папярэджанне.

Цэнтральная камісія *мае права* таксама адмовіць у рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты пры перавышэнні асобай, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты, больш чым на 20 працэнтаў максімальнага памеру расходавання сродкаў выбарчага фонду, або выкарыстанні ў гэтых жа памерах грашовых сродкаў акрамя сродкаў выбарчага фонду.

Рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты можа быць абскарджана асобай, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

### Рэгістрацыя ініцыятыўных груп

У адпаведнасці з Каляндарным планам дакументы для рэгістрацыі ініцыятыўных груп павінны быць прадастаўлены ў ЦВК не пазней за 15 мая 2020 года. Адметнасцю гэтай кампаніі стала тое, што з дня прызначэння выбараў (8 мая) да заканчэння тэрміну падачы заяў аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп у ЦВК (15 мая) – 7 дзён. На прэзідэнцкіх выбарах 2015 года на гэты этап адводзілася 17, а падчас выбараў 2010 года – 10 дзён.

За два дні да прызначэння выбараў быў затрыманы для выканання вынесенага ў пачатку года адміністрацыйнага арышту папулярны блогер Сяргей Ціханоўскі, які заяўляў аб намеры вылучацца кандыдатам. У выніку ён быў пазбаўлены магчымасці асабіста падаць дакументы на рэгістрацыю сваёй ініцыятыўнай групы.

Усяго 55 чалавек падалі заявы ў ЦВК аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп, з іх 30 прадстаўлялі групу “кандыдатаў пратэсту” Мікалая Статкевіча. На выбарах Прэзідэнта 2015 года было пададзена 15 заяў аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп[4], на выбарах 2010 года – 19[5], у 2006 годзе – 8, у 2001 – 27 заяў[6]. Такім чынам, падчас сёлетняй выбарчай кампаніі падалі рэкордную за ўсю гісторыю прэзідэнцкіх выбараў колькасць заяў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты.

Разгляд гэтых заяў адбываўся на трох пасяджэннях ЦВК, якія трансляваліся ў жывым эфіры, што можна адзначыць як станоўчую практыку па забеспячэнні галоснасці ў дзейнасці ЦВК падчас эпідэміі COVID-19, вартую пераймання ТВК.

Зарэгістраваныя 15 ініцыятыўных груп – Аляксандра Лукашэнкі, Алега Гайдукевіча, Юрыя Ганцэвіча, Уладзіміра Няпомняшчых, Наталлі Кісель, Віктара Бабарыкі, Валерыя Цапкалы, Сяргея Чэрачня, Вольгі Кавальковай, Ганны Канапацкай, Андрэя Дзмітрыева, Святланы Ціханоўскай, Аляксандра Таболіча, Юрыя Губарэвіча і Мікалая Казлова, што складае 27% ад агульнай колькасці разгледжаных заяў аб рэгістрацыі. На выбарах 2015 года было зарэгістравана 8 ініцыятыўных груп (53% ад агульнай колькасці пададзеных заяў), на выбарах 2010 года – 15 (79%), у 2006 годзе – 8 (100%), у 2001 годзе – 23 групы (85%).

Рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі прынята ў дачыненні да 40 чалавек, у прыватнасці было адмоўлена ў рэгістрацыі амаль усім “кандыдатам пратэсту” – паплечнікам Мікалая Статкевіча.[7] Больш падрабязна факты гэтага этапу

[4] http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-PRB2015-Sved2.pdf.
[5] http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-PRB-sved1.pdf.
[6] http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Archive-Elections-PRB2001-Inic.pdf.
[7] Адзіным “кандыдатам пратэсту”, чыю ініцыятыўную групу зарэгістраваў ЦВК, стаў Уладзімір Няпомняшчых.

выбарчай кампаніі і іх прававая ацэнка прадстаўлены ў справаздачы нашай кампаніі.[8]

Аналіз характару адмоў у рэгістрацыі ініцыятыўных груп дазваляе зрабіць высновы, што ЦВК выкарыстоўвала пераважна наступныя падставы:

1. Парушэнне прынцыпу добраахвотнасці ўдзелу выбаршчыкаў у ініцыятыўных групах па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты.
2. Недастатковая колькасць ініцыятыўнай групы (менш за 100 чалавек), якая ўзнікае ў выніку выключэння з пададзенага спісу асоб, звесткі аб якіх не адпавядаюць патрабаванням ВК.
3. Неадпаведнасць вылучаемых кандыдатур патрабаванням ВК.
4. Невыкананне парадку вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты.

Адносна парушэння прынцыпу добраахвотнасці ўдзелу выбаршчыкаў у ініцыятыўных групах звернем увагу на некаторыя моманты. ЦВК выказала сумневы ў добраахвотнасці ўдзелу выбаршчыкаў, у сувязі з чым правяла праверку: у Дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі МУС былі накіраваныя запыты і ўстаноўленыя шматлікія недакладнасці пашпартных дадзеных выбаршчыкаў у спісах некаторых ініцыятыўных груп. Акрамя таго, ЦВК звярнулася да мясцовых уладаў з даручэннем спраўдзіць уключэнне ў ініцыятыўныя групы грамадзян шляхам іх персанальнага абзвону. Вынікі гэтай працэдуры і далі падставы Цэнтральнай камісіі гаварыць аб парушэнні прынцыпу добраахвотнасці ўдзелу ў выбарах. У той жа час вылучэнцы, апытаныя на пасяджэнні ЦВК, не мелі магчымасці аспрэчыць падобныя звесткі. Яны паведамілі, што ў тэлефонных размовах з грамадзянамі супрацоўнікі мясцовых выканкамаў запалохвалі і ўводзілі іх у зман, таму рашэнні аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп “кандыдатаў пратэсту” ў сувязі з парушэннем прынцыпу добраахвотнасці з’яўляюцца палітычна матываванымі.

У аналітыкаў кампаніі выклікаў пытанне факт прад’яўлення прэтэнзій толькі да асобных кандыдатаў. Цэнтральная камісія не прывяла аргументаў, чаму, напрыклад, аналагічная праверка не праводзілася ў дачыненні да ініцыятыўных груп іншых вылучэнцаў, у спісе якіх налічвалася вялікая колькасць выбаршчыкаў. Не паведамлялася таксама, ці былі падобныя праверкі ўвогуле. Селектыўны падыход да рэгістрацыі ініцыятыўных груп, які дэманструе ЦВК у сёлетняй выбарчай кампаніі, сведчыць аб маніпуляцыях палажэннямі ВК з боку Цэнтральнай камісіі і не спрыяе даверу да яе неперадузятасці.

Пра неадпаведнасць вылучаемых кандыдатур патрабаванням ВК як падставу для адмовы ў рэгістрацыі адзначым, што яна была выкарыстаная для адмовы Мікалаю Статкевічу і падчас выбарчай кампаніі 2015 года. Паводле арт. 60 ВК, кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь не могуць быць вылучаны грамадзяне, якія не маюць права займаць пасады ў дзяржаўных органах і іншых дзяржаўных арганізацыях у сувязі з наяўнасцю судзімасці. У той жа час Канстытуцыя не прадугледжвае такога абмежавання. Варта ўзгадаць, што

[8] Справаздача па выніках назірання за рэгістрацыяй ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты. Даступна тут: http://elections2020.spring96.org/be/news/97044.

асуджэнне Мікалая Статкевіча ў 2011 годзе па “справе аб масавых беспарадках” было прызнана міжнароднымі і беларускімі праваабарончымі арганізацыямі неабгрунтаваным і не адпавядаючым міжнародным абавязальніцтвам Беларусі ў галіне правоў чалавека[9]. Міжнародныя і беларускія правабарончыя арганізацыі неаднаразова заклікалі ўлады краіны да рэабілітацыі ўдзельнікаў “справы аб масавых беспарадках”, у тым ліку, да аднаўлення выбарчага права Мікалая Статкевіча.

На падставе невыканання парадку вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты вынесена пастанова аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Сяргея Ціханоўскага, які на той момант адбываў адміністрацыйны арышт. ЦВК указала, што заява аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы павінна быць падпісана толькі самой асобай, якая мае намер вылучыцца. Прааналізаваўшы абставіны, якія папярэднічалі пачатку выбараў, эксперты кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” лічаць, што выбарчыя правы Сяргея Ціханоўскага былі парушаны, улады спецыяльна стварылі сітуацыю, пры якой ён пазбавіўся магчымасці рэалізаваць свае права стаць кандыдатам у Прэзідэнты.

### Збор подпісаў выбаршчыкаў

*Вызначэнне месцаў, забароненых для пікетавання з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты*

У адпаведнасці з Каляндарным планам мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады вызначылі месцы, забароненыя для правядзення пікетавання з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў. Аналіз рашэнняў паказвае, што яны істотна не адрозніваюцца ад падобных рашэнняў папярэдняй прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, а таксама кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў 2019 года.

Некаторыя назіральнікі паведамляюць аб паляпшэнні ўмоў. Напрыклад, у г. Маладзечна і раёне адбылася некаторая лібералізацыя.[10] Аб змяншэнні колькасці забароненых месцаў у параўнанні з выбарамі Прэзідэнта 2015 года сведчаць назіральнікі з Магілёва, Гродна, Ліды, Вілейкі, Светлагорска, Бярозы.

У некаторых раёнах знялі забарону на збор подпісаў на тэрыторыі ўстаноў адукацыі і аховы здароўя, якая існавала ў 2015 годзе. Па меркаванні аналітыкаў кампаніі, гэта стварыла дадатковыя ўмовы для супрацьпраўнага выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу ў падтрымку дзеючага кіраўніка краіны. Хаця і сёння па месцы працы грамадзян магчымасць дзейнічаць мае практычна толькі ініцыятыўная група кіраўника дзяржавы.

[9] Гл. напрыклад Меркаванне Працоўнай групы ААН па адвольных затрыманнях № 13/2011: https://www.unwgaddatabase.org/un/Document.aspx?id=2757.
[10] Даступна тут: http://molodechno.minsk-region.by/images/14-05-2020-5.pdf.

*Збор подпісаў*

Адметнай рысай сёлетняй выбарчай кампаніі стаў рост пратэстных настрояў, які выразіўся ў вялікай актыўнасці грамадзян на пікетах па зборы подпісаў за апазіцыйных прэтэндэнтаў. Гэта, а таксама эпідэміялагічная сітуцыя ў краіне, неабходнасць сацыяльнага дыстанцыянавання, абумовіла пошукі штабамі і ініцыятыўнымі групамі новых форм праяўлення выбарчай актыўнасці з шырэйшым выкарыстаннем сацыяльных сетак і больш індывідуальным падыходам да выбаршчыка.

На пытанне, ці былі перашкоды пры зборы подпісаў з боку ўлады, 67% назіральнікаў кампаніі паведамілі, што іх не было, адпаведна 33% зафіксавалі такія з’явы ў рэгіёнах назірання.

Пасля падзей 29 мая ў Гродна, калі ў выніку інцыдэнта быў затрыманы Сяргей Ціханоўскі і яшчэ дзевяць ўдзельнікаў яго пікета, на зборшчыкаў подпісаў і каардынатараў ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай пачалі аказваць ціск. 31 мая ў розных рэгіёнах Беларусі былі затрыманы не менш за 32 чалавекі – блогеры і актывісты, некаторыя з якіх з’яляюцца сябрамі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты[11]. Сярод пацярпелых – Уладзімір Кніга, Вольга Каракіна, Мікалай Салянік, Станіслава Дамшэль, Аляксандр Мілюк, Юлія Карначова. Дзеянні ў дачыненні да іх уключалі затрыманні, арышты, штрафы, суправаджалася перартрусамі па месцы іх пражывання, ціскам ва ўмовах лячэбнай установы і інш. Факты сведчаць, што ў сваіх мэтах улады выкарыстоўвалі і сітуацыю з COVID-19. Так, 8 чэрвеня ў Мастах рэгіянальны каардынатар ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай па Гродзеншчыне Аляксандр Мілюк фактычна быў пазбаўлены магчымасці ажыццяўляць сваю дзейнасць. Без дакументальнага пацвержання, што ён – кантакт першага роўню па COVID-19, супрацоўнікі міліцыі вынеслі актывісту прадпісанне пад пагрозай адміністрацыйнай адказнасці 14 дзён знаходзіцца ў самаізаляцыі.

Беларускія ўлады спрабавалі знізіць градус грамадскай актыўнасці, запалохаць выбаршчыкаў ў сувязі з тым, што выбарчая кампанія набірала абароты і ўсё больш прыцягвала ўвагу людзей. У Мінску, Віцебску, Гомелі і іншых гарадах адзначаны дзеянні супрацоўнікаў міліцыі па запалохванню ўдзельнікаў пікетаў. Праз гукаўзмацняльную апаратуру людзям, якія чакалі сваёй чаргі паставіць подпіс у падтрымку кандыдата, гаварылася, што іх знаходжанне ў гэтым месцы з’яўляецца незаконным масавым мерапрыемствам. Грамадзяне і сябры ініцыятыўных груп папярэджваліся, што калі яны не разыйдуцца, да іх можа быць ужытая фізічная сіла.

У сувязі з гэтым аналітыкі кампаніі звярталі увагу, што ў адпаведнасці з ч. 11 арт. 61 ВК збор подпісаў можа ажыццяўляцца ў форме пікетавання. Атрыманне дазволу на правядзенне пікетавання для ўказаных мэтаў не патрабуецца, калі яно праводзіцца ў месцах, не забароненых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі

[11] Больш падрабязна тут: http://spring96.org/be/news/97256

органамі. Дзеянні супрацоўнікаў міліцыі з’яўляліся незаконнай перашкодай рэалізацыі права на збор подпісаў выбаршчыкаў за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты шляхам пікетавання.

Павышаную ўвагу праяўлялі праваахоўныя органы і мясцовыя ўлады да пікетаў, якія праходзілі з удзелам саміх прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду. Так, 8 чэрвеня ў Віцебску на пікеце па зборы подпісаў, на якім выступаў Валерый Цапкала, знаходзіліся некалькі супрацоўнікаў міліцыі ў грамадзянскай форме, адзін з іх здымаў выступ, стоячы блізка ад выступоўцы. Прысутнічаў таксама старшыня Віцебскага гарвыканкама Вадзім Заранкін. Таксама ў Віцебску, дзе пікеты за апазіцыйных кандыдатаў прыцягвалі вялікую колькасць грамадзян, супрацоўнікі ў цывільным здымалі чэргі на відэакамеры. Пазней гэтыя відэазапісы служылі міліцыянерам падставай для затрыманняў і вынясення штрафаў.

У Брэсце кіраўнікі Ленінскай раённай камісіі ў суправаджэнні людзей у цывільным рэгулярна наведвалі пікеты, надаючы асаблівую ўвагу тым, на якіх вёўся збор подпісаў у падтрымку Святланы Ціханоўскай. Гэта стварала дадатковае напружанне для зборшчыкаў і саміх грамадзян. Асоб, якія імкнуліся справакаваць канфлікт, абражалі сяброў ініцыятыўнай групы С. Ціханоўскай, ніхто не затрымліваў.

Узбуджэнне крымінальных спраў супраць лідараў пратэсту, арышты і пераслед актывістаў, інфармацыя пра зневажаючыя чалавечую годнасць умовы ў ізалятарах часовага ўтрымання стварылі негатыўны ўплыў на сяброў ініцыятыўных груп. Акрамя таго, некаторыя з тых, хто спачатку актыўна займаўся зборам подпісаў, з-за пагроз з боку ўладаў пазней былі вымушаны адысці ад спраў, каб не патрапіць пад рэпрэсіі, напрыклад, страціць уласны бізнэс і інш.

Ужо 25 мая (праз чатыры дні пасля пачатку збора подпісаў) на нарадзе па актуальных сацыяльна-эканамічных і палітычных пытаннях Аляксандр Лукашэнка заявіў аб значнай колькасці сабраных у яго падтрымку подпісаў.[12] Ініцыятыўная група дзеючага Прэзідэнта традыцыйна самая вялікая. Яе склад, як заўважаюць аналітыкі, расце ад выбараў да выбараў: сёлета – 11480 чалавек, у 2015 годзе – 10 577 чалавек, у 2010 годзе – 8403 і інш. Сябры ініцыятыўнай групы Аляксандра Лукашэнкі працуюць у грамадскіх прыёмных “Белай Русі” ў кожным з раёнаў сталіцы і ва ўсіх абласных гарадах. Пры гэтым назіральнікі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” паведамляюць, што пікеты па збору подпісаў за вылучэнне Аляксандра Лукашэнкі былі нешматлікія і насілі, асабліва ў сталіцы, загадзя арганізаваны характар. На пытанне ці зафіксаваны факты выкарыстання адміністратыўнага рэсурсу пры зборы подпісаў у падтрымку дзеючага Прэзідэнта, такія як прымус, збор подпісаў па месцы працы, у працоўны час, не сябрамі ініцыятыўнай групы і інш., 60% назіральнікаў кампаніі адказалі станоўча.

---

[12] Даступна тут: https://www.belta.by/president/view/my-sdaem-ekzamen-narodu-lukashenko-poruchil-proanalizirovat-voprosy-s-kotorymi-obraschajutsja-ljudi-392182-2020/

Арганізаваны збор подпісаў прайшоў у ААТ “Беларуськалій”, ААТ “Магілёўхімвалакно”, ААТ “Светлагорскхімвалакно”, ААТ “Светлагорскі ЦКК”, ААТ “Гродна Азот”, ААТ “Брэсцкі электралямпавы завод”. Аналагічная сітуацыя ў РУП «Брэстэнерга», у ААТ “Шклозавод “Нёман””, ВУП “Калінкавіцкі малочны камбінат”, у падраздзяленнях РУТТ “Беларуснафта” і многіх іншых.

У канцы мая кампанія “Праваабаронцы за свабодныя выбары” запусціла форму для збору фактаў выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу пры вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты. За час яе работы праваабаронцам паведамілі каля сотні такіх фактаў. Прыкладна чвэрць з іх – пагрозы звальнення ў той ці іншай форме на адрас працаўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў у выпадку іх непадпарадкавання. У той жа час не знайшлі пацвярджэння заявы А. Лукашэнкі аб тым, што на прыватных прадпрыемствах звальнялі асоб, якія адмаўляліся падтрымаць вылучэнне альтэрнатыўных кандыдатаў. Назіральнікамі кампаніі не зафіксаваны ні адзін такі выпадак, падобнай інфармацыі не паступіла і ў згаданую вышэй форму.

## Праверка сапраўднасці подпісаў

19 чэрвеня 2020 г. закончыўся збор подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Цэнтральная камісія апублікавала звесткі аб колькасці подпісаў, прызнаных сапраўднымі[13].

У абсалютнай большасці выпадкаў назіральнікам кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” адмовілі ў праве назіраць за працэдурай праверкі подпісаў з матывіроўкай, што гэта не прадугледжана ВК. Адзначаны адзінкавыя факты пазітыўнага ўзаемадзеяння ТВК з назіральнікамі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары”, як, напрыклад, у Баранавіцкай гарадской ТВК.

Назіральнікі былі дапушчаны пераважна толькі на пасяджэнні ТВК з павесткай “Аб устанаўленні колькасці выбаршчыкаў, якія аддалі свае галасы ў падтрымку прапановы аб вылучэнні кандыдатаў ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь” (фактычна – зацвярджэнне пратаколаў па праверцы подпісаў). Гэтыя пасяджэнні праходзілі досыць фармальна і доўжыліся ад 6 хвілін, як у Крычаўскай раённай ТВК, да паўгадзіны.

Выбарчыя камісіі пацвердзілі збор неабходных 100 тысяч подпісаў шасцю прэтэндэнтамі, уключаючы Віктара Бабарыку, які знаходзіцца ў зняволенні. Валерыю Цапкалу пацвердзілі сапраўднасць толькі 75 тысяч 249 подпісаў. Паводле інфармацыі яго штаба, было здадзена ўсяго 200 тысяч подпісаў. Афіцыйныя лічбы выглядаюць так: Аляксандар Лукашэнка – 1 939 572 подпісаў, Віктар Бабарыка – 165 744, Ганна Канапацкая – 146 588, Сяргей Чэрачань – 143 109, Андрэй Дзмітрыеў – 106 841, Святлана Ціханоўская – 104 757.

[13] Даступна тут: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2020/stat15.pdf.

29–30 чэрвеня са штабоў прэтэндэнтаў, ад назіральнікаў і СМІ стала паступаць інфармацыя пра адхіленні подпісаў за Валерыя Цапкалу і Віктара Бабарыку. Такім чынам, на этапе праверкі ТВК скасавалі дзясяткі тысяч фактаў волевыяўлення выбаршчыкаў пераважна ў двух альтэрнатыўных лідэраў прэзідэнцкай гонкі. Па дадзеных ЦВК, самы вялікі адсотак несапраўдных подпісаў ад агульнай колькасці правераных у Віктара Бабарыкі (13,57%) і Валерыя Цапкалы (14,25%). У той жа час у Аляксандра Лукашэнкі доля несапраўдных подпісаў 1,46%, у Ганны Канапацкай – 3,14%, у Святланы Ціханоўскай – 5,01%, у Андрэя Дзмітрыева – 5,38% і ў Сяргея Чэрэчня – 6,42%.

Прыведзеная дыяграма адлюстроўвае абагульненыя (да тысяч) дадзеныя, якія характарызуюць адсеў подпісаў, зроблены ЦВК па ўсіх кандыдатурах, акрамя А. Лукашэнкі[14]. Лічбы па галасах у падтрымку кіраўніка дзяржавы не паказаны з-за іх вялікай колькасці прапарцыйна колькасці ў іншых прэтэндэнтаў. За А. Лукашэнку падалі 2 млн подпісаў, залічана 1 939 572 (97%).




Дадатковай падставай для недаверу і прадметам шырокага абмеркавання ў СМІ і сацсетках паслужыў той факт, што ў двух патэнцыйных кандыдатаў Цэнтральная камісія прызнала большую колькасць подпісаў, чым яны папярэдне заяўлялі самі. Так, Ганна Канапацкая паведамляла, што здала ў ТВК 110 тысяч, а па выніках у ЦВК у яе атрымалася больш за 146 тысяч сапраўдных подпісаў (залічана 133%). Каманда Чэрачня заявіла пра 106 тысяч, а ў ЦВК выйшла больш за 143 тысячы (залічана 135%). Акрамя таго, у падтрымку Дзмітрыева залічаны

[14] Дадзеныя аб колькасці зданных подпісаў прыведзены з паведамленняў асоб, якія вылучаліся кандыдатамі ў Прэзідэнты, ці іх прадстаўнікамі.

106 841 подпіс, у той час як сам прэтэндэнт указваў прыблізную колькасць – “105–107 тысяч”.

Так, паводле афіцыйных дадзеных, колькасць галасоў ў падтрымку Ганны Канапацкай, сабраная ў беларускай сталіцы, перавышае сумарную колькасць галасоў, аддадзеных у Мінску за Бабарыку і Цапкалу, якія былі прызнаныя сапраўднымі. Варта адзначыць, што па звестках назіральнікаў і паведамленнях СМІ, найбольшай адметнымі ў кампаніі былі якраз групы па збору подпісаў за Бабарыку, Ціханоўскую і Цапкалу. Яны працавалі вельмі інтэнсіўна і актыўна падтрымліваліся выбаршчыкамі. Агучаныя афіцыйныя вынікі, у тым ліку па сталічнаму рэгіёну, яшчэ больш узмацнілі недавер грамадства да дзейнняў улад і ЦВК, якія грунтуюцца на непразрыстасці працэдур праверкі подпісаў за вылучэнне.

Выбарчы працэс застаецца цалкам непразрыстым для грамадскасці і ўдзельнікаў ў выбарах, з працоўнымі матэрыяламі ТВК (пратаколы, падпісныя лісты, пакеты дакументаў, якія прадастаўляюцца ў камісію) азнаёміцца фактычна забаронена.

## Рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты

У адпаведнасці з Каляндарным планам рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты адбывалася з 5 па 14 ліпеня ўключна. У апошні дзень гэтага тэрміну – 14 ліпеня – прайшло пасяджэнне ЦВК, на якім былі разгледжаны заявы аб рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты.

Па выніках разгляду дакладаў старшынь абласных і Мінскай гарадской выбарчых камісій ЦВК устанавіў агульную колькасць подпісаў выбаршчыкаў, якія былі прызнаныя сапраўднымі. Лічбы адпавядалі звесткам[15], якія ЦВК апублікавала раней, з адным выключэннем: ЦВК залічыў подпісы, сабраныя ў падтрымку вылучэння Валерыя Цапкалы, якія былі пададзеныя ў ТВК Першамайскага раёна г. Бабруйска. Раней адпаведная ТВК прызнала ўсе подпісы, пададзеныя за вылучэнне Цапкалы, несапраўднымі, паколькі яны былі здадзены асобай, якая, па меркаванні ТВК, не з’яўлялася каардынатарам. Цэнтральная камісія прызнала, што гэта – тэхнічная памылка, а асоба з’яўляецца каардынатарам. Таму 2 975 подпісаў, пададзеныя ў ТВК Першамайскага раёна г. Бабруйска, былі залічаны. Але гэта істотна не паўплывала на агульную колькасць подпісаў, сабраных за яго вылучэнне.

Разгледзеўшы адпаведныя матэрыялы і заявы прэтэндэнтаў, ЦВК прыняў рашэнне аб рэгістрацыі кандыдадатамі ў Прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі, Ганны Канапацкай, Андрэя Дзмітрыева, Сяргея Чэрэчня, Святланы Ціханоўскай.

ЦВК адмовіў у рэгістрацыі кандыдатамі ў Прэзідэнты Віктару Бабарыку і Валерыю Цапкалу.

---

[15] Даступна тут: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2020/stat15.pdf

Адмову ў рэгістрацыі Віктара Бабарыкі ЦВК абгрунтавала парушэннем патрабаванняў ч. 9 арт. 48 ВК, а менавіта – парушэнне забароны прамога або ўскоснага ўдзелу ў фінансаванні і іншая матэрыяльная дапамога замежных дзяржаў і арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, міжнародных арганізацый, арганізацый, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, а таксама неадпаведнасцю рэчаіснасці звестак аб даходах і маёмасці ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці В. Бабарыкі.

Як паведаміла старшыня ЦВК, аснову ініцыятыўнай групы па вылучэнні кандыдатам у Прэзідэнты Віктара Бабарыкі, складалі супрацоўнікі ААТ "Белгазпрамбанк", якія ў свой працоўны час займаліся арганізацыйным і тэхнічным забеспячэннем працы па вылучэнні Віктара Бабарыкі з выкарыстаннем маёмасці банка. Банк, па сутнасці, з'яўляецца арганізацыяй, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якой выступаюць замежныя дзяржавы і замежныя арганізацыі. У якасці прыкладаў выкарыстання ў інтарэсах вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Віктара Бабарыкі грашовых сродкаў ці іншай матэрыяльнай дапамогі замежнай арганізацыі старшыня ЦВК назвала факты выкарыстання службовага транспарту ААТ "Белгазпрамбанк" для забеспячэння працы ініцыятыўнай групы, падрыхтоўку выступу прэтэндэнта з выкарыстаннем тэхнікі банка, выкарыстанне службовых памяшканняў для працы ініцыятыўнай групы і інш.

Да дэкларацыі Віктара Бабарыкі ЦВК прэтэнзій не выказала. Але была агучана інфармацыя Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь. Згодна з ёй, паводле КДК, у дэкларацыі прэтэндэнта не адлюстраваны матэрыяльныя сродкі і нерухомая маёмасць, якія знаходзяцца ў яго фактычнай уласнасці і карыстанні, а таксама даходы ад дзейнасці шэрагу падкантрольных яму беларускіх камерцыйных структур.

З ліста КДК таксама было агучана, што "Бабарыка непасрэдна стварыў і кіраваў дзейнасцю арганізаванай злачыннай групы з ліку былых і дзеючых кіраўнікоў ААТ "Белгазпрамбанк", чальцы якой зарэгістравалі ў афшорнай юрысдыкцыі Брытанскіх Віргінскіх астравоў з рахункамі ў банках Кіпра, а таксама іншых дзяржаў сетку падкантрольных так званых фірмаў-пракладак, праз якія ажыццяўляў вываз за мяжу і наступную легалізацыю сродкаў, атрыманых злачынных шляхам, у тым ліку ад названых вышэй беларускіх суб'ектаў гаспадарання".

Відавочна, што ў лісце КДК змешчана інфармацыя з крымінальнай справы, адным з фігурантаў якой з'яўляецца Віктар Бабарыка. Паколькі гэта крымінальная справа яшчэ расследуецца, і віна Бабарыкі не ўстаноўлена прысудам суда, выкарыстанне гэтых звестак у якасці падставы для адмовы ў рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты, з'яўляецца незаконным і супярэчыць канстытуцыйнаму прынцыпу прэзумпцыі невінаватасці і міжнародным абавязацельствам краіны па правах чалавека. Адмова Віктару Бабарыку ў

рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты на гэтых падставах парушае яго права быць абраным[16].

Адмова ў рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты Валерыя Цапкалы была абгрунтавана ЦВК недастатковай колькасцю сапраўдных подпісаў выбаршчыкаў, а таксама прадстаўленнем у дэкларацыі аб даходах і маёмасці жонкі прэтэндэнта не адпавядаючых рэчаіснасці звестак, якія маюць істотны характар (не пазначэнне ёй акцый ААТ "Прыорбанк").

## Акцыі пратэсту супраць вынікаў рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты

Увечары 14 ліпеня ў розных гарадах краіны людзі выйшлі на вуліцы, каб выказаць пратэст супраць адмовы ў рэгістрацыі кандыдатамі на пост прэзідэнта альтэрнатыўных вылучэнцаў – Віктара Бабарыкі і Валерыя Цапкалы. Каля васьмі вечара пачаліся затрыманні. Усяго, па звестках праваабарончага цэнтру "Вясна"[17], па ўсёй Беларусі былі затрыманы каля 250 чалавек, з іх каля 200 чалавек – у Мінску. Сярод затрыманых – журналісты, якія ажыццяўлялі прафесійную дзейнасць па асвятленні акцый.

15 ліпеня стала вядома пра тое, што Упраўленне Следчага камітэту па г. Мінску распачало крымінальную справу па арт. 342 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь "па факце арганізацыі і актыўнага ўдзелу ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак на тэрыторыі горада Мінска, які звязаны з яўным непадпарадкаваннем законным патрабаванням супрацоўнікаў органаў унутраных спраў"[18].

[16] Нагадваем, што згодна з арт. 25 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, кожны грамадзянін павінен мець без якой бы то ні было дыскрымінацыі і без неабгрунтаваных абмежаванняў права і магчымасць быць абраным на сапраўдных перыядычных выбарах, якія праводзяцца на аснове ўсеагульнага роўнага выбарчага права пры таемным галасаванні і якія забяспечваюць свабоднае волевыяўленне выбаршчыкаў. У адпаведнасці з арт. 28 Канстытуцыі, ніхто не можа быць прызнаны вінаватым у злачынстве, калі яго віна не будзе ў прадугледжаным законам парадку даказана і ўстаноўлена прысудам суда. Аналагічная норма замацавана ў п. 2 арт. 14 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

[17] Даступна тут: http://spring96.org/be/news/98230

[18] Даступна тут: https://t.me/skgovby/2839